и многообразие форм, отражавшие тесную связь с иудаизмом и общиной, стали причиной юридических ошибок в оценке самого понятия «благотворительность» и иных способов оказания помощи.

Касаясь вопроса архивных и статистических источников еврейской благотворительности, следует отметить, что их изучение невозможно без тщательного исследования ее религиозной и законодательной базы. Первая объясняет, почему именно тот или иной аспект выбран в качестве цели общества, вторая позволяет идентифицировать форму благотворительности как правового явления.

Архивные источники имеют характер констатации того или иного довода, возникшего в процессе изучения первых двух источников, и могут подтвердить или опровергнуть выдвинутое предположение. В них зафиксированы детали и нюансы механизма реализации общественного явления через ту или иную правовую конструкцию.

Материалы архивов Республики Беларусь, содержащие сведения о деятельности еврейских благотворительных обществ, позволяют определить их особенности по сравнению с другими регионами Российской империи в XIX – начале XX в. и свидетельствуют о широком распространении еврейских благотворительных обществ на территории белорусских губерний.

В целом необходимо отметить, что еврейская благотворительность, как духовно-нравственное явление, представляет собой наиболее универсальный и продуманный комплекс видов помощи, обеспечивающих возможность человеку выжить и оставаться личностью. Как правовое явление, еврейская благотворительность была реализована в деятельности не только благотворительных обществ, но и совершенно неблаготворительных объединений, доказав всем ходом исторических событий, как, например, в годы Первой мировой войны, удивительную мобильность, приспособляемость, широту распространения и привлечение значительного числа людей к благотворительности, итогом чего стали тысячи спасенных физически и духовно. Самым важным является то, что еврейская благотворительность на территории Беларуси в начале XX в. начинает утрачивать свои национальные признаки и становится благотворительностью, основанной на началах гуманизма, где приоритетен человек, а его потребность в помощи является руководством к действию для благотворителя.

БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЙ СПИСОК

1. Полный свод законов Российской империи (ПСЗ РИ). Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1880. Т. 6, № 8054. П. 76.
2. Свод узаконений о евреях с 1825 по 1885 г. / под ред. Е. Б. Левина. СПб., 1885.
3. Трудовая помощь. СПб., 1902. № 1.
4. ПСЗ РИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1880. Т. 6, № 24299. П. 1.
5. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). Ф. 2649. Оп. 1. Д. 222.
6. Материалы об экономическом положении евреев в России. СПб., 1904. Т. 2. Табл. 60 – 62.
7. Памяць. Бабруйск. Мінск, 1995.
8. НИАБ. Ф. 2649. Оп. 1. Д. 162.
9. НИАБ. Ф. 2649. Оп. 1. Д. 365.
10. НИАБ. Ф. 2649. Оп. 1. Д. 490.

Поступила в редакцию 28.01.2015.

Юлия Валерьевна Функ – кандидат исторических наук, доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета БГУ.

УДК 94(476)«1861-1914»

С. М. ТОКЦЬ

ДЗЕЙНАСЦЬ ВАЛАСНЫХ СУДОЎ У БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У ПАСЛЯРЭФОРМЕННЫ ПЕРЫЯД (1861–1914): САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ АСПЕКТЫ

Рассматриваются социокультурные аспекты деятельности крестьянских волостных судов на белорусских землях в пореформенный период. Определена степень влияния традиционной культуры и менталитета крестьян на деятельность волостных судов. Главными источниками для проведения исследования послужили архивные материалы и опубликованные статистические данные. В результате проведенного анализа установлено, что главным недостатком в деятельности волостных судов была их зависимость от исполнительной власти, а на судебные решения оказывали большое влияние волостные старшины и писари. Показано, что большинство волостных судей были неграмотными и соглашались занять эту должность только под принуждением. Источники также свидетельствуют, что представители государственной администрации критически оценивали деятельность волостных судов и предлагали усилить бюрократический контроль над ними. Однако анализ статистических данных показал, что количество судебных разбирательств в волостных судах постоянно возрастало. Это значит, что волостные суды в целом справлялись со своими функциями. Они были нужны крестьянам и помогали деревне разрешать сложные имущественные споры в непростой период перехода от традиции к модерности.

Ключевые слова: волостной суд; крестьянское самоуправление; коррупция; бюрократический контроль.

The article deals with the socio-cultural aspects of township courts in Belarus in the post-reform period. The aim of the study was to determine the degree of influence of traditional culture and mentality of the peasants to solve township courts. The main sources of the study were archival materials, as well as the published statistics. The analysis showed that the major drawback in the activities of township courts was their dependence on the executive. Judicial decisions are influenced by peasant bosses and secretaries. The study

also showed that the majority of the peasant judges were illiterate and agreed to take this position only under duress. Sources also indicate that members of the public administration critically assessed the activities of township courts and proposes to strengthen bureaucratic control over them. However, the analysis of statistical data shows that the number of trials in the peasant courts is constantly growing. This means that the courts tend to cope with their functions. These institutions have helped residents of the Belarusian village to resolve property disputes in a difficult period of transition from tradition to modernity.

Key words: parish court; peasant self-government; corruption; bureaucratic control.

Важным інстытутам у сістэме саслоўнага сялянскага самакіравання на беларускіх землях у пасляраформенны перыяд з'яўляліся валасныя суды, якія пасля скасавання паншчыны функцыянальна замянілі сабой вотчынны суд землеўладальніка. Гэтыя суды разглядалі на падставе нормаў мясцовага звычаёвага права дробныя крымінальныя (бойкі, крадзяжы, асабістыя абразы) і грамадзянскія (звычайна маёмасныя спрэчкі) справы паміж вяскоўцамі. Суддзі абіраліся на валасных сходах на адзін ці на тры гады з ліку паважаных гаспадароў волосці (якія не былі пад судом і не падвяргаліся пакаранням за розныя правіны) у колькасці ад чатырох да дванаццаці асоб у залежнасці ад памераў волосці. Кожную асобную справу разглядалі тры суддзі, абраныя па волі жэрабя. Праблематыка дзейнасці сялянскага самакіравання ў апошнія гады выклікае асаблівую зацікаўленасць беларускіх гісторыкаў [1–3]. У дадзеным артыкуле зроблена спроба сацыяльна-культурнага аналізу функцыянавання інстытута валаснога суда на аснове аналізу статыстычных дадзеных і матэрыялаў судаводства з мэтай вызначэння ўплыву на іх дзейнасць ментальнасці вясковых жыхароў і традыцыйнай сялянскай культуры.

Ужо з самага пачатку выявіўся галоўны недахоп у дзейнасці валаснога суда – залежнасць ад выканаўчай улады. Этнограф Адам Багдановіч пісаў у сваіх успамінах пра валасных старшынь і пісараў: «К их услугам всегда был волостной суд, который постановлял то, что эти власти хотели» [4, с. 57–58]. Нярэдка валасныя начальнікі асабіста загадвалі біць сялян розгамі, а ўжо постфактум суды прымалі адпаведныя пастановы. У час рэвізіі валасных устаноў Гродзенскай губерні ў 1868 г. віленскі чыноўнік Сяльвестраў прызнаваў, што «старшина нередко имеет влияние на ход волостных судов», а таксама пісаў пра «вмешательство писаря» ў валаснае судаводства [5, арк. 39]. Прычым ён адзначаў, што «телесные наказания исполняются тут же» пасля вынясення прыгавору, што было парушэннем закону [5, арк. 41–42]. У справаздачы бабруйскага павятовага з'езда міравых пасярэднікаў Мінскай губерні ў сакавіку 1868 г. гаварылася, што валасны суд «принадлежит к предметам еще наименее развившимся: причиною тому еще слабая гражданственность; самые служебные действия волостных старшин и писарей будут требовать еще долго отеческой опеки» [6, арк. 13].

Праведзенае па загаду гродзенскага губернатара Цэймерна ў 1881 г. расследаванне дзейнасці валасных пісараў у Гродзенскім павеце паказала, што ўмяшальніцтва апошніх у дзейнасць валасных судоў часам набывала проста гратэскавыя формы. Пра пісара Азёрскай волосці Шостака чыноўнік Хвастоў пісаў, што «все решения волостного суда составляются за деньги по его же указанию, часто даже помимо желания волостных судей, которые иногда даже и не знают, как решено дело <…> одно и то же дело решается на волостном суде несколько раз, то в пользу одной, то в пользу другой стороны, смотря по тому, кто больше заплатит писарю <…> составляются волостным писарем совершенно неправильные приговоры сельских сходов, о существовании которых суд даже и не знает» [7, арк. 6]. Пры гэтым мясцовы міравы пасярэднік Шахаў нават не прымаў ад сялян скаргі на пісара [7, арк. 8]. І падобная сітуацыя з'яўлялася на той час хутчэй нормай, чым выключэннем. У чым заключаліся прычыны такога становішча з сялянскім судом? Па-першае, сяляне, за выключэннем дзяржаўнай вёскі, не мелі традыцыі ўласнага судаводства, паколькі да скасавання прыгону суд ажыццяўляў землеўладальнік ці яго ўпаўнаважаны. Па-другое, за выкананне абавязку валаснога суддзі вяскоўцы не атрымлівалі грашовага ўзнагароджання і разглядалі гэта як чарговую павіннасць. Таму валаснымі суддзямі звычайна па чарзе абіраліся ўсе гаспадары волосці, што адпавядалі вызначаным законам крытэрыям. У большасці, асабліва ў першыя пасляраформенныя дзесяцігоддзі, яны былі непісьменнымі. Гэтыя акалічнасці не спрыялі аўтарытэту валаснога суда і яго незалежнасці.

Яшчэ адным відавочным недахопам у дзейнасці валасных судоў быў той, што ў час судовых разбіральніцтваў як суддзі, так і ўсе астатнія іх удзельнікі звычайна знаходзіліся ў нецвярозым стане. У 1899 г. нарада шляхецкіх маршалкаў і міравых пасярэднікаў Гродзенскай губерні нават прапаноўвала «сделать распоряжения, чтобы винные лавки, а в особенности трактиры безусловно прекращали торговлю вечером накануне дня заседаний волостных судов и собрания сходов волостных и сельских» [8, с. 73]. Можна меркаваць на падставе архіўных крыніц, што традыцыя пачастунку валасных суддзяў гарэлкай так і захавалася непарушнай. Калі такі пачастунак выйграўшы справу бок рабіў пасля разбіральніцтва, гэта лічылася абсалютна нармальным.

Колькасць судовых спраў магла моцна вагацца ў залежнасці ад велічыні волосці, а таксама спецыфікі ментальнасці яе жыхароў. Але яна ўвесь час узрастала ва ўсіх беларускіх губернях. Паводле дадзеных С. А. Талмачовай, у Віленскай губерні колькасць спраў валасных судоў узрасла з 1,6 тыс. у 1871 г. да 2,4 тыс. у 1876 г., а ў Мінскай за гэты ж перыяд – з 3,5 тыс. да 5,9 тыс. [9, с. 118]. У 1887 г. у Віцебскай губерні валасныя суды разгледзелі 7331 дробную крымінальную справу (абвінавачваліся 9172 асобы, ці прыкладна 1 асоба з 78 душ сялянскага насельніцтва) і 19 074 грамадзянскія справы. У сярэднім выходзіла на адзін суд 31 крымінальная справа і 97 – грамадзянскіх. На пастановы валасных судоў было пададзена 3899 скаргаў (абскарджвалася кожная сёмая пастанова), і 653 пастановы (адна з 40) былі адменены павятовымі прысутнасцямі. Гэта значыць, што прыкладна кожная шостая скарга задавальнялася [10, с. 77].

У Магілёўскай губерні ў 1888 г. былі прыцягнуты да суда па дробных крымінальных учынках 13 255 чал. (11 726 мужчын і 1529 жанчын), што складала 0,14 % ад колькасці сялянскага насельніцтва (2,5 % мужчын і 0,3 % жанчын). З іх ліку былі апраўданы 3126 асоб (2683 мужчыны і 443 жанчыны), прысуджаны да фізічнага пакарання (біцця розгамі) 1845 мужчын, да арышту – 2087 (1604 мужчыны і 483 жанчыны), да грашовых штрафаў – 5014 (4622 мужчыны і 392 жанчыны), да грамадскіх работ – 831 (664 мужчыны і 167 жанчын), да вусных вымоў – 356 (308 мужчын і 44 жанчыны) [11, с. 183]. У 1899 г. валаснымі судамі Магілёўскай губерні разглядаліся дробныя крымінальныя ўчынкі 14 488 асоб, у тым ліку 12 894 мужчын (1,9 % ад усяго мужчынскага насельніцтва) і 1594 жанчын (0,2 % ад усяго жаночага сялянскага насельніцтва). З іх ліку 2047 мужчын былі прыгавораны да фізічнага пакарання (0,3 % ад мужчынскага сялянскага насельніцтва), 2445 асоб (1906 мужчын і 539 жанчын) арыштаваны, 5083 (4674 мужчыны і 409 жанчын) аштрафаваны, 1052 асобы (920 мужчын і 132 жанчыны) прыгавораны да грамадскіх работ, 348 (312 мужчын і 36 жанчын) атрымалі вымовы [12].

За 1900 г. у Магілёўскай губерні ў валасных судах было заведзена 15 277 спраў па дробных крымінальных учынках і 39 593 справы па маёмасных спрэчках [13, ведомость 45]. У крымінальных учынках абвінавачваліся 15 705 чал., у тым ліку 13 131 мужчына (каля 2 % ад усяго сялянскага мужчынскага насельніцтва) і 2574 жанчыны (0,4 % ад усяго сялянскага жаночага насельніцтва). З іх ліку былі апраўданы 3625 мужчын і 822 жанчыны, а асуджаны да розных пакаранняў і спагнанняў 9505 мужчын і 1752 жанчыны. Сярод асуджаных 1124 чал. прыгаварылі да цялеснага пакарання (каля 0,2 % ад усяго мужчынскага насельніцтва), да арышту – 3800 мужчын (0,6 %) і 1018 жанчын (0,1 %), да грашовых штрафаў – 2120 мужчын і 277 жанчын, да грамадскіх работ – 2286 мужчын і 412 жанчын, 175 мужчын і 45 жанчын атрымалі толькі вымовы [13, ведомость 33].

У Віцебскай губерні ў 1899 г. валасныя суды разглядалі справы аб дробных учынках 14 488 асоб, у тым ліку 12 894 мужчын (2,2 % ад усяго мужчынскага сялянскага насельніцтва) і 1594 жанчын (0,3 % ад усяго жаночага сялянскага насельніцтва). З іх ліку 2047 чал. былі прыгавораны да фізічнага пакарання (0,35 % ад усяго сялянскага насельніцтва мужчынскага полу), 2445 – да арышту (0,4 %), 4083 – да штрафаў (0,7 %), 1052 – да грамадскіх работ, 348 атрымалі вусныя вымовы [14].

У Віленскай губерні ў 1889 г. валаснымі судамі разглядалася 5715 спраў па дробных крымінальных учынках (абвінавачваліся 7005 асоб) і 11 227 грамадзянскіх спраў [15, с. 52]. У 1897 г. валаснымі судамі Віленскай губерні было разгледжана 4189 дробных крымінальных учынкаў і 7200 грамадзянскіх спраў. Па крымінальных учынках абвінавачваліся 4073 асобы (0,4 % ад усяго сялянскага насельніцтва), з ліку якіх 400 пакараны розгамі, што складала 0,09 % ад сялянскага насельніцтва мужчынскага полу, а 1953 апраўданы, і 883 (21 %) справы залагоджаны прымірэннем бакоў. Па маёмасных спрэчках 534 справы (7,4 %) былі завершаны мірам [16, с. 95].

У 1897 г. у Гродзенскай губерні валаснымі судамі былі разгледжаны 34 273 грамадзянскія справы і 8814 дробных крымінальных [17]. У параўнанні з 1869 г. колькасць грамадзянскіх спраў вырасла ў гэтай губерні ў 9,5 разы [18]. З ліку грамадзянскіх спраў у 1897 г. 15 538 (45,3 %) былі завершаны прымірэннем бакоў. У ходзе разгляду крымінальных спраў былі прыцягнуты да адказнасці 8884 асобы (0,8 % ад усяго сялянскага насельніцтва), з якіх 2705 (30,4 %) апраўданы, а 4791 асоба (0,4 % ад усяго сялянскага насельніцтва), у тым ліку 4005 мужчын (0,7 % ад колькасці мужчынскага сялянскага насельніцтва) і 786 жанчын (0,14 % ад колькасці жаночага сялянскага насельніцтва), прысуджана да розных пакаранняў: да грашовых спагнанняў – 2325, арышту – 1337, фізічнага пакарання – 447 (0,07 % ад колькасці мужчынскага сялянскага насельніцтва), грамадскіх работ – 360. Цікава, што колькасць прыгавораў да фізічнага пакарання ў Гродзенскай губерні ў параўнанні з 1869 г. зменшылася ў 3,4 разы. Ды і фактычна было пакарана толькі 166 асоб (38,6 % ад агульнай колькасці прыгавораных да біцця). Астатнія пазбеглі пакарання ці пасля апеляцыі ў вышэйшыя інстанцыі (35,8 % прыгавораных), ці з іншых прычын. Гэта сведчыла пра выразную гуманізацыю адносін валасных судоў у гэтым пытанні. Можна меркаваць, што галоўнай прычынай крымінальных разбіральніцтваў былі сваркі і бойкі паміж сялянамі, паколькі дробныя крадзяжы складалі толькі 1,3 % ад агульнай колькасці такіх спраў. Усяго ж у 1897 г. на прыгаворы валасных судоў Гродзенскай губерні было пададзена 5550 апеляцый у вышэйшыя інстанцыі (12,8 %). Гэта сведчыла, што ў цэлым дадзеныя ўстановы карысталіся даверам сялян і выконвалі свае функцыі.

У Мінскай губерні ў 1897 г. валаснымі судамі было разгледжана 34 626 грамадзянскіх і 13 118 крымінальных спраў [19]. З ліку грамадзянскіх спраў 45 638 (44,4 %) завяршыліся прымірэннем. У ходзе разгляду крымінальных спраў былі прыцягнуты да адказнасці 36 904 асобы (2,4 % ад усяго сялянскага насельніцтва), з якіх 14 394 (39 %) былі апраўданы, а 20 700, у тым ліку 17 378 мужчын (2,3 % ад усяго мужчынскага сялянскага насельніцтва) і 3322 жанчыны (0,4 % ад усяго жаночага сялянскага насельніцтва) асуджаны на розныя пакаранні: грашовыя спагнанні – 8227, арышт – 5397, фізічнае пакаранне – 3400 (гэта складала 0,45 % ад усяго мужчынскага насельніцтва), фактычна пакараных было 1508, ці 44,4 % ад асуджаных на гэтае пакаранне, грамадскіх работ – 2512. Крадзяжы (728) складалі 1,8 % ад агульнай колькасці крымінальных спраў. На пастановы валасных судоў у Мінскай губерні было пададзена 4500 апеляцый (3,1 %).

Такім чынам, дзейнасць валасных судоў закранала даволі значную частку сялянскага насельніцтва, асабліва ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі, дзе суды прымалі таксама і больш жорсткія пастановы адносна тых, хто здзейсніў дробныя крымінальныя ўчынкі. Колькасць грамадзянскіх спраў у некалькі разоў

перавышала колькасць крымінальных спраў. У вёсках хутка сфарміравалася нефармальная адвакатура, якая пераважна складалася з мясцовых пісьменных сялян і яўрэяў. Віленская па сялянскіх справах прысутнасць нават сцвярджала ў 1891 г., што «в редкой волости не найдется таких крестьян, которые, мало-мальски зная грамоту, совсем бросают занятия хлебопашеством, избирая адвокатуру» [20, арк. 61].

Шмат увагі дзейнасці валасных судоў надавалі члены камітэтаў і нарадаў аб патрэбах сельскай гаспадаркі, якія дзейнічалі ў беларускіх губернях на пачатку ХХ ст. Адзін з членаў віленскай нарады па праблемах сельскай гаспадаркі пісаў: «Волостные суды, руководствующие неопределенным, шатким понятием обычного права, являются постоянным источником нескончаемых тяжб между крестьянами. О начале строгой справедливости здесь не может быть речи, ибо свидетельскими показаниями возможно всегда установить существование в данной местности такого обычая, какой необходим для более зажиточной и более влиятельной из заинтересованных сторон» [21, с. 47]. А таму, лічылі ўдзельнікі нарады, было б карысна падпарадкаваць сялян «общему с остальным населением правопорядку и предоставить этому наиболее многочисленному классу возможность руководствоваться во всех своих житейских нуждах твердыми основаниями закона, единого и равного для всех» [21, с. 47]. Лідскі павятовы камітэт таксама прыйшоў да высновы, што рэформа валаснога суда наспела, паколькі яго існаванне на дадзены момант з'яўляецца бессэнсоўным і нават шкодным: «Полный произвол, взятки, пьянство – вот спутники этого учреждения, извратившего смысл и значение высокогуманного закона» [21, с. 132]. Ашмянскі павятовы камітэт прапаноўваў «нынешние волостные суды упразднить», а калі гэта зрабіць немагчыма, тады: «а) избирать в волостные суды лиц не моложе 35-летнего возраста, обязательно окончивших народные училища; б) назначить им вознаграждение; в) решения считать не окончательными; г) ввести институт почетных волостных судей из местных помещиков» [21, с. 179–180].

Але валасныя суды пры слушнасці многіх крытычных выказванняў усё ж выконвалі свае функцыі ў развязванні шматлікіх спрэчак і канфліктаў паміж сялянамі, колькасць працягвала ўзрастаць і на пачатку ХХ ст. Напрыклад, у 1905 г. валаснымі судамі Гродзенскай губерні было разгледжана 27 402 дробныя крымінальныя справы, ці па 154 справы ў сярэднім на адзін суд. Гэта ў 3,1 разы перавышала паказчык 1897 г. Большасць сярод гэтых спраў складалі цяжбы па асабістых крыўдах сялян – 53,6 %, на справы аб крадзяжах і падманах прыпадала 13,8 %. Грамадзянскіх спраў валаснымі судамі гэтай губерні ў 1905 г. было разгледжана 61 077, ці ў сярэднім 343 на адну ўстанову [22, арк. 18–19]. Гэта лічба ў 1,8 разы перавышала паказчык 1897 г. Абсалютная большасць грамадзянскіх спраў (75 %) датычыла маёмасных спрэчак паміж сялянамі.

Самым суровым пакараннем, на якое меў права валасны суд, было біццё розгамі за дробныя крымінальныя ўчынкі – не больш 20 удараў. Варта звярнуць асаблівую ўвагу на гэты аспект штодзённасці тагачаснага вясковага жыцця. Фізічны гвалт над асобай выступаў яго неад'емным элементам. А пакаранні розгамі сталі важнай часткай дзейнасці валаснога кіравання пасля рэформы. А. Багдановіч успамінаў, што ў воласці «порка была явлением обычным – и какая порка! ...Пороли беспощадно и за недоимку в подушных, и за недоимку в выкупных (это, так сказать, административная порка) <…> за ссоры, драки, сопротивления» [4, с. 57–58]. Звычайна пакаранне выконвалі паліцэйскія дзясяцкія. У некаторых валасцях пакаранне розгамі было вельмі пашырана, а ў іншых амаль не выкарыстоўвалася. Гэта залежала ад асобы валаснога старшыні, ад звычаяў і традыцый, што панавалі ў той ці іншай мясцовасці. Напрыклад, у 1871 г. у Свіслацкай воласці Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні цялесныя пакаранні стасаваліся 28 разоў, а ў Юшкаўскай воласці таго ж павета ніводнага разу [23, арк. 4]. У Косаўскай воласці Слонімскага павета Гродзенскай губерні ў 1888 г. секлі сялян ажно 39 разоў. У валасцях Гродзенскага павета ў тым жа годзе валасныя суды ў сярэднім прыгаворвалі да біцця розгамі 5 асоб. У Магілёўскай губерні ў 1900 г. у сярэднім асобны валасны суд прыгаворваў да гэтага пакарання 7–8 чал. за год [24, ведомость 33]. Але ў цэлым, як ужо вышэй паказвалася на прыкладзе Гродзенскай губерні, колькасць фізічных пакаранняў з часам істотна зменшалася. У 1904 г. цялесныя пакаранні ў валасных судах былі забаронены. З таго часу за дробныя крадзяжы і іншыя малазначныя крымінальныя злачынствы валасны суд максімальна мог пакараць арыштам да 1 мес.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны колькасць спраў у валасных судах яшчэ болей узрасла. У 1912 г. у Віленскай губерні разглядалася 17 438 дробных крымінальных і 42 726 грамадзянскіх спраў. На адзін валасны суд у сярэднім выходзіла 119 крымінальных і 291 грамадзянская справа [25, с. 93]. У Мінскай губерні ў 1913 г. у валасных судах разглядаліся 39 784 дробныя крымінальныя і 107 353 грамадзянскія справы. У павятовых судах гэтай губерні было разгледжана 16 206 апеляцый на пастановы валасных судоў [26, с. 67]. У 1913 г. у Магілёўскай губерні перад валаснымі судамі была абвінавачана за дробныя крымінальныя ўчынкі 36 471 асоба (31 134 мужчыны і 5337 жанчын), што ў 2,5 разы перавышала паказчык 1899 г. З іх ліку 9710 асоб (8266 мужчын і 1444 жанчыны) былі арыштаваны, на 3253 (2950 мужчын і 303 жанчыны) накладзены грашовыя штрафы, 282 (248 мужчын і 34 жанчыны) атрымалі вымовы [27]. У Віцебскай губерні за 1914 г. валаснымі судамі было разгледжана 73 089 спраў, у тым ліку 16 634 крымінальныя і 56 455 грамадзянскіх, ці ў сярэднім на адзін суд 85 крымінальных і 288 грамадзянскіх [28, с. 59].

Валасныя суды адыгралі вельмі важную ролю ў працэсе сацыяльна-культурнай трансфармацыі беларускай вёскі ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. У дзейнасць гэтага інстытута ад пачатку яго існавання

быў закладзены шэраг істотных супярэчнасцей, якія спараджалі складаныя для вырашэння праблемы. Галоўнымі недахопамі з'яўлялася залежнасць ад выканаўчай улады, а таксама непісьменнасць суддзяў, адсутнасць матэрыяльнага іх узнагароджання. Але ў цэлым валасныя суды выконвалі свае задачы і на падставе нормаў існаваўшага звычаёвага права, традыцыйных уяўленняў беларускіх сялян пра справядлівасць вырашалі шматлікія канфлікты і развязвалі спрэчныя сітуацыі ў жыцці паслярэформеннай вёскі.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. *Талмачова С. А.* Сялянскае самакіраванне ў Беларусі (1861–1901 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2002.
2. *Талмачова С. А.* Эвалюцыя дзейнасці органаў сялянскага самакіравання. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму : вучэб. дапам. : у 5 ч. Ч. 2. Актуальныя праблемы аграрнай гісторыі / склад. А. П. Жытко [і інш.] ; пад агул. рэд. А. П. Жытко. Мінск, 2007. С. 5–110.
3. *Маскевіч Г. І.* Сацыяльная арганізацыя сельскай грамады Беларусі ў 60–90-я гг. ХІХ ст. // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. 2008. № 2. С. 13–18.
4. *Богданович А.* Мои воспоминания // Неман. 1984. № 6. С. 38–89.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Літвы (НГАЛ). Ф. 378. Воп. 1869 а/а. Спр. 1110.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 242. Воп. 1. Спр. 1034.
7. НГАЛ. Ф. 378. Воп. 1882 а/а. Спр. 611.
8. Крестьянское дело в Гродненской губернии. Свод заключений по вопросам рассмотренным Совещанием Предводителей Дворянства и Мировых Посредников в 1899 году. Гродна, 1900.
9. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2011. Кн. 1.
10. Обзор Витебской губернии за 1888 г. Витебск, 1888.
11. Памятная книжка Могилевской губернии на 1890 г. Могилев на Днепре, 1890. С. 183.
12. Обзор Могилевской губернии за 1899 г. Могилев, 1900.
13. Обзор Могилевской губернии за 1900 г. Могилев, 1901.
14. Обзор Витебской губернии за 1899 г. Витебск, 1900.
15. Обзор Виленской губернии за 1889 г. Вильна, 1889.
16. Обзор Виленской губернии за 1897 г. Вильна, 1898.
17. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (НГАБ у Гродне). Ф. 10. Воп. 1. Спр. 2796.
18. НГАБ у Гродне. Ф. 10. Воп. 13. Спр. 795.
19. НГАБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 2611.
20. НГАЛ. Ф. 378. Воп. 1891 а/а. Спр. 392. Арк. 61.
21. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. Т. IV. Виленская губерния. СПб., 1903.
22. НГАБ у Гродне. Ф. 18. Воп. 1. Спр. 80.
23. НГАБ у Гродне. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 259.
24. Обзор Могилевской губернии за 1900 г. Могилев, 1900.
25. Обзор Виленской губернии за 1912 г. Вильна, 1912.
26. Обзор Минской губернии за 1913 г. Минск, 1914.
27. Обзор Могилевской губернии за 1913 г. Могилев, 1914.
28. Обзор Витебской губернии за 1914 г. Витебск, 1915.

Паступіў у рэдакцыю 21.01.2015.

Сяргей Міхайлавіч Токць – кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

УДК 947,6(1914-1918)

В. В. ВОЛКАВА

КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ НЯМЕЦКАЙ АКУПАЦЫІ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў ФОНДАХ АРХІВАЎ І БІБЛІЯТЭК ГЕРМАНІІ

Рассматриваются письменные источники по истории немецкой оккупации Беларуси в годы Первой мировой войны, систематизированные в соответствии с региональными и проблемными принципами. Анализируются четыре группы источников: законодательные и делопроизводственные (организационно-распорядительная, информационно-справочная и отчетная документация) документы, документы личного происхождения и периодические издания. Изучены материалы из следующих архивов и библиотек Германии: Политического архива Министерства иностранных дел Германии, Федерального архива в Берлине, Тайного государственного архива прусского культурного наследия, двух филиалов Федерального архива земли Баден-Вюртемберг: Генерального федерального архива Карлсруэ и Главного государственного архива Штутгарта, а также Берлинской государственной библиотеки прусского культурного наследия и Библиотеки Берлинского университета имени Гумбольдта.

Ключевые слова: Первая мировая война; немецкая оккупация; архивы и библиотеки Германии; экономическое положение; военные администрации Литва и Белосток – Гродно.

The article systematizes written sources for the history of the German occupation of Belarus during World War I based on regional and case approaches. Four groups of the sources were analysed: legislative and administrative documents (organizational, information, and reporting documentation), personal documents and periodicals. These include materials from the following German archives and libraries: Political Archive of the Federal Foreign Office (Auswärtiges Amt Politisches Archiv), Federal Archives (Bundesarchiv in Berlin-Lichterfelde), Prussian Privy State Archives (Geheimes Staatsarchiv Preußischer Kulturbesitz), two departments of the State Archive Baden-Württemberg (Landesarchiv Baden-Württemberg) – Central State Archives of Karlsruhe (Generallandesarchiv Karlsruhe) and Central State Archives of Stuttgart (Hauptstaatsarchiv Stuttgart), Berlin State Library – Prussian Cultural Heritage (Staatsbibliothek zu Berlin – Preußischer Kulturbesitz), Humboldt University Library (Universitätsbibliothek der Humboldt-Universität zu Berlin).

Key words: World War I; German occupation; archives and libraries of Germany; economic situation; military administrations Litauen and Białystok – Grodno.

